Адкуль жа іголкі:
з Вожыка
ці з ёлкі?

*А. Зэкаў.*



Падкрэсліце мнагазначнае слова, якое сустрэлася ў вершы. Якія значэнні яно мае? У якім значэнні гэта слова ўжыта ў вершы?

## Прамое і пераноснае значэнне слова

**149.** Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы?

| | |
|---|---|
| Бабуля **выглянула** ў акно. | паказалася |
| Сонейка **выглянула** з-за воблака. | паглядзела |
| Тата **напаіў** дачушку малаком. | паліў |
| Дождж **напаіў** дрэвы і траву. | даў папіць |

Спішыце сказы, у якіх прыродныя з'явы апісваюцца вобразна. Дзякуючы якім словам ствараецца вобразнае апісанне?

**во́блака**

Словы могуць ужывацца ў прамым і пераносным значэнні. **Прамое** значэнне слова з'яўляецца пачатковым, асноўным. **Пераноснае** значэнне ўзнікае звычайна пры пераносе назвы з аднаго прадмета на другі на аснове іх падабенства.



Правообладатель Национальный институт образования

**150.** Прачытайце тэкст. Якую мову можна назваць вобразнай?

## Вобразная мова

Людзі часта гавораць вобразамі: дождж **ідзе**, рэчка **бяжыць**. Хоць усім вядома, што ні ў дажджу, ні ў рэчкі няма ног. «Вецер **вые**», — кажам мы і ўяўляем сабе вецер у вобразе жывой істоты. А пра сонейка, бывае, гаворым: «Сонейка **ўсміхаецца**». Сонейка не ўсміхаецца, гэта мы радасна ўсміхнуліся і **павесялелі**, калі яно **выглянула** з-за цёмнай хмары.

Кожнае слова тоіць у сабе не толькі назву рэчы або з'явы, у ім гучыць наша пачуццё. *(Паводле В. Віткі.)*

У якім значэнні ўжыты ў сказах выдзеленыя словы?

Спішыце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту.

**151.** Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайцеся малюнкамі-падказкамі. Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні.

Мама … .
Сонейка … .



Дзядуля … .
Снег … .





Правообладатель Национальный институт образования

Ракета … .
Час … .



Вада … .
Работа … .



**152.** Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы?

**Паўзе** па небе цёмная хмара. **Бяжыць** да рэчкі чысты ручаёк. Журавіны чырвонымі шарыкамі **рассыпаліся** па балоце. **Танцуюць** над кветкамі прыгожыя матылькі.

Прыдумайце і запішыце сказы, у якіх гэтыя словы будуць ужывацца ў прамым значэнні.

**153.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

Ля кусціка ракітнага —
вочка блакітнае.
Удзень да яго
сонейка спускаецца,
а ночкай —
месяц купаецца.

*У. Карызна.*

к ы і р н ц а

З чым параўноўваецца крыніца ў загадцы?

Запішыце другі сказ загадкі. Падкрэсліце ў ім словы, якія ўжыты ў пераносным значэнні.



Правообладатель Национальный институт образования

**154.** Прачытайце верш. Чаму ў хлопчыка цудоўны настрой?

### Цудоўны настрой

У мяне настрой цудоўны:
дожджык скача, цёплы, спо́рны,
клапатлівы і ласкавы,
мые дрэвы, поіць травы.
Гром злуецца, дождж смяецца,
на маю кашулю льецца.

*Я. Крупенька.*

**спо́рны** — часты

Якія словы ў вершы робяць дождж падобным на чалавека? У прамым ці пераносным значэнні яны ўжыты?

Спішыце апошні сказ верша. Падкрэсліце ў ім словы, ужытыя ў пераносным значэнні.

**155.** Прачытайце. Выпішыце тыя спалучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.

**Залатыя** рукі, **залатыя** завушні́цы; **мяккі** хлеб, **мяккі** характар; **хвост** лісы, **хвост** цягніка; **цёплыя** словы, **цёплае** малако; **халодныя** вятры, **халодныя** фарбы; **светлы** дзень, **светлы** ўспамін; **гарачая** кава, **гарачая** пара́; **цвёрды** арэх, **цвёрдае** рашэнне.

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце і запішыце сказ.



Правообладатель Национальный институт образования